ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
12 САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 9(1530)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт

## ТЭЛЕТАЙП

ЎЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

### Універсітэцкі

конкурс вясёлых і знаходлівых выйшаў на фінішную прамую. Нядаўна адбылася сустрэча каманд ФПМ, юрыдычнага, фізічнага і гістарычнага факультэтаў. Хто стане пераможцам КВЗ? На гэта пытанне адкажа фінал, у якім сустрэнуцца матэматыкі і фізікі.

Г. СВЯТЛЯК.

### Рыхтуецца

першае пасяджэнне дыскусійнага клуба «Музычны рынг». Яго адкрывае студэнцкі клуб і камітэт камсамола універсітэта. Арганізатары плануюць выклікаць на рынг акадэмічную капэлу БДУ, ансамбль «Неруш», адну з мінскіх рок-груп. Вашы прапановы пра тое, як лепш арганізаваць работу, каго запрашаць на рынг,— чакаюць у студэнцкім клубе (401 пакой галоўнага корпуса).

М. ТАРАСАВА,
мастацкі кіраўнік студклуба.

### Упершыню

на хімічным факультэце праведзены конкурс «Ану, дзяўчаты!». У ім прынялі ўдзел студэнткі вячэрняга аддзялення Наталля Шарамет, Жанна Шышло, Алена Марчанка, Аксана Бугай.

Вядучая, інжынер кафедры радыяцыйнай хіміі Наталля Бірукова назвала журы, у састаў якога ўвайшлі супрацоўнікі факультэта Т. Абраменка, Н. Шаметкава, С. Сіняк, У. Сімірскі, прадстаўнік інстытута культуры В. Карпенка.

Цікавасць выклікалі ўсе этапы конкурсу: літаратурны, танцавальны, музычны, прафесійны, кулінарны. Усім прысутным асабліва спадабаўся апошні. За кароткі час дзяўчаты здолелі прыгатаваць вытанчаныя халодныя стравы, смак і якасць якіх змаглі ацаніць гледачы.

Пераможцай конкурсу стала Жанна Шышло. Астатнім удзельніцам былі ўручаны кветкі і падарункі.

Н. ГУЛЕЙЧЫК.

### Выбраны

жаночы савет універсітэта. Старшынёй стала дацэнт кафедры цэлафізікі член парткома А. С. Каспяровіч.

А. САЎЧЫК.

### На факультэце

журналістыкі прайшло анкетаванне студэнтаў з мэтай вызначэння якасці выкладання лекцый. Вынікі анкетавання надрукаваны ў насценгазеце «Журналіст».

М. ГОРКА.



факт біяграфіі

## ОРДЭН БАЙЦА СБА

МІКАЛАЙ РЫГОРАВІЧ ПРЫГОДЗІЧ, старшы выкладчык БДУ імя У. І. Леніна, — будатрадавец са стажам. З 1973 года кожнае лета для яго — асаблівае, таму што непаўторны кожны працоўны семестр. Пра будатрадаўскі рух разважае ён нетаропка, умее, як кажуць, паставіць сябе на месца падначаленага, убачыць праблему вачыма радавога байца — усе прыступкі будатрадаўскай «кар'еры» ім пройдзены, вопыту не займаць. Мікалай Рыгоравіч шэсць разоў узначальваў Клецкі занальны студэнцкі атрад, які штогод дабіваўся высокіх вынікаў у вытворчай і грамадска-палітычнай дзейнасці. Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга — такую ацэнку атрымала праца М. Р. Прыгодзіча. Але гэта не вынік, а хутчэй стымул да таго, каб яшчэ актыўней, мэтанакіраваней займацца справай, якую даверылі. Бо колькі яшчэ нявырашаных пытанняў!

Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

пазыўныя трэцяга працоўнага

## ЛЕТА МІНУЛАЕ — ЛЕТА БУДУЧАЕ...

Яно ўсміхаецца вуснамі юнакоў і дзяўчат у будатрадаўскай форме. Яно закланочана глядзіць на новыя будынкі. палі і фермы вачыма тых жа юнакоў і дзяўчат. Яно — гэта працоўнае лета студэнтаў. У аўдыторыях усё яшчэ не сціхаюць размовы пра семестр 1986 года. І тут жа ўзнікаюць размовы пра новы семестр: Давайце ўспомнім лета мінулае і пагаворым пра лета будучае.

У МІНУЛЫМ працоўным семестры ва універсітэце працавалі 78 студэнцкіх атрадаў: будаўнічыя, сельскагаспадарчыя, навуковыя, праваднікоў, гандлёвыя і інш. Падведзеныя вынікі сведчаць аб добрай працы студэнтаў, адлюстроўваюць вялікую ідэалагічную і палітыка-масавую работу. Я не буду прыводзіць лічбаў, мне хацелася б пагаварыць аб пытаннях і праблемах, якія хвалявалі штаб працоўных спраў універсітэта, камандзіраў і камісараў лінейных атрадаў. Давайце пачнём з назваў атрадаў.

Ужо даўно ўсім вядома, што назва атрада — гэта яго візітная картка. Яна павінна быць кароткай, гучнай, несці ідэйны сэнс, адлюстроўваць сутнасць будаўнічага руху. Але ў нас часам назвы атрадаў не адпавядаюць гэтым патрабаванням. Аб чым гавораць назвы «Градыент», «Гравітон», «Тахіон», «Юнона»? Кароткасць тут ёсць. Калі вельмі пастарацца — можна знайсці сэнс і падвесці пад ідэю. Але спачатку трэба даведацца, што азначаюць гэтыя тэрміны. Аб мілагучнасці ж гаварыць не даводзіцца, таму што неспецыялісту цяжка вымавіць і запомніць такія «творы» нашых фізікаў і матэматыкаў.

Своеасаблівацю лета-86 з'явілася нечаканая перадыслакацыя некаторых будаўнічых атрадаў. Замест Карэліі, Пскоўскай вобласці яны паехалі ў Гомельскую вобласць, каб будаваць жыллё для пацярпеўшых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. І радуе, што байцы зразумелі сваю задачу і працавалі з адказнасцю. Горача падтрымалі ўсе атрады універсітэта прапанову байцоў «Рытма» (юрфак) — адпрацаваць дадатковы дзень Ударнай працы ў фонд пацярпеўшых ад аварыі. Гэтыя факты яшчэ раз паказваюць, што зводны студэнцкі атрад БДУ імя У. І. Леніна працягвае слаўныя традыцыі будаўнічага руху: быць там, дзе патрабуе час, дзе цяжэй, не адмяжоўвацца ад спраў краіны.

Упершыню ва універсітэце быў сфарміраваны «макаранкаўскі» атрад, дзе побач з нашымі студэнтамі працавалі падлеткі. Першыя крокі, першыя няўдачы. Але байцы атрада ўпэўнены, што гэта форма прыжывецца ў БДУ.

У адрас рэктарата, камітэта камсамола ідуць падзякі, просьбы зноў прысылаць нашых студэнтаў. Гэта радуе.

Універсітэцкі штаб працоўных спраў зноў мае вельмі заклапочаны выгляд. Зразумела — набліжаецца чарговы працоўны семестр. Амаль на ўсіх факультэтах сфарміраваны атрады. У гэтым годзе працягваюць свае шматгадовыя традыцыі «Мара», «Стэлуца», «Рытм» і інш. З'яўяцца новыя. Фарміруюцца два атрады за мяжу: у ГДР, Балгарыю. Плануецца ўвесці новую форму працы: аграпрамысловы атрад. Сутнасць гэтага атрада ў тым, што ён з'яўляецца зводным і аб'ядноўвае некалькі лінейных атрадаў. Адзін лінейны атрад працуе ў калгасе ці саўгасе на ўборцы садавіны, агародніны. У састаў гэтага атрада ўваходзяць некалькі чалавек, якія маюць вадзіцельскія правы. За атрадам замацоўваюцца машыны. Байцы атрада самі ўбіраюць, грузяць і вязуць ураджай у горад, дзе перадаюць тавар другому атраду для перапрацоўкі. Байцы надаюць прадукту гандлёвы выгляд і перадаюць гандлёваму атраду, які рэалізуе прадукцыю. Такі метад працы пазбавіць уборачныя атрады ад прастояў, заробак будзе залежаць ад саміх байцоў.

Гэта толькі схема. Ад вас жа, паважаныя чытачы, мы чакаем прапаноў, заўваг. Прыходзьце ў штаб працоўных спраў, мы заўсёды рады выслухаць вас, параіцца з вамі. Таму што працоўны семестр — для ўсіх, і хочацца, каб кожнае лета, праведзенае ў атрадзе, было непаўторным і незабыўным.

В. МАСКАЛЕНКА,
камісар штаба працоўных спраў універсітэта.

*на маршы — СБА*

# У ДОБРЫ ШЛЯХ, «СТЭЛУЦА»!

**ЗДАЕЦЦА, ЗУСІМ НЯДАЎНА ЯНЫ Ў ВЫЦВІЛАЙ БУДАТРАДАЎСКАЙ ФОРМЕ, З РУКЗАКАМІ ЗА ПЛЯЧЫМА І ГІТАРАМІ АДРАЗУ З ВАКЗАЛА СПЯШАЛІСЯ НА СВОЙ ФАКУЛЬТЭТ, КАБ ХУТЧЭЙ СУСТРЭЦЬ СЯБРОЎ-АДНАКУРСНІКАЎ, ПАДЗЯЛІЦЦА ДУМКАМІ, УРАЖАННЯМІ, НА ЯКІЯ БЫЎ БАГАТЫ ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР...**

І ВОСЬ ПРАДСТАЎНІКІ дзевяці будаўнічых атрадаў, што будуць дзейнічаць у час працоўнага саместра на механіка-матэматычным факультэце, сабраліся ў камітэце камсамола для размовы пра сваё будучае. Атрымаўся своеасаблівы сход, на якім было выказана шмат слушных заўваг і прапаноў. З яго і пачынаецца знаёмства з будаўнічымі атрадамі мехмата.

Стаць байцом атрада «Стэлуца» — запаветная мара многіх студэнтаў. І не толькі таму, што ўжо некалькі гадоў дыслацыруецца ён у Стаўрапольскім краі. Расказваюць камісар атрада — студэнтка IV курса Лідзія Цярэнцьева і баец — другакурсніца Ірына Парукевіч.

**— Як, на вашу думку, чаму атрад карыстаецца такой папулярнасцю сярод студэнтаў?**

**Ірына Парукевіч:** — Мне пашанцавала трапіць у лік студэнтаў-першакурснікаў, што мінулым летам сталі байцамі «Стэлуцы». Чым славіцца наш атрад? Па-першае, жаданнем працаваць як належыць. І гэта не проста словы. Амаль заўсёды за дзень мы выконвалі двайную норму, здаралася, што і больш. А яшчэ ў атрадзе ёсць магчымасць кожнаму выявіць свае здольнасці. Дадаць да гэтага таварыскую ўзаемадапамогу, сапраўднае сяброўства паміж членамі атрада, змястоўны адпачынак, знаёмства з цудоўнымі мясцінамі, і тады стане зразумела ўзрастаючая колькасць заяў.

*З гісторыі «Стэлуцы».* *Атрад існуе больш дзевяці гадоў. Першым месцам яго дыслакацыі была Малдавія. Вельмі спадабалася тады атрадаўцам малдаўскае слова «стэлуца», што ў перакладзе азначае «зорачка». З таго часу атрад і атрымаў сваю назву, хоць і змянілася месца дыслакацыі. Ужо шосты раз атрад будзе выязджаць у саўгас «Цішчанскі» Стаўрапольскага краю.*

**— Як зараз ідзе фарміраванне атрада? Па якому прынцыпу ажыццяўляецца набор байцоў?**

**Лідзія Цярэнцьева:** — У гэтым годзе фарміраванне атрада мы пачалі раней. Пры плане набору 50 чалавек — ужо зараз пададзена больш 60 заяў. Падрыхтоўчы перыяд дазваляе пазнаёміцца з людзьмі, з якімі пазней прыйдзецца працаваць. Якім чынам? У нас не менш аднаго разу ў месяц праводзіцца атрадны сход, выпускаем насценгазету, арганізоўваем суботнікі. Тут добра бачна, хто як выяўляе сябе ў працы. Ёсць і такія, хто не ўдзельнічае ў мерапрыемствах, маўляў, гэта зусім неабавязкова. Зразумела, такія студэнты атраду не патрэбны.

**Ірына Парукевіч:** — Пажадана, каб да нас прыходзілі людзі творчыя. Бо будатрад — гэта не толькі праца, гэта яшчэ і цікавыя вечары адпачынку, і добрыя песні пад гітару ля кастра, і выступленні перад мясцовымі жыхарамі, і выпускі сваёй газеты. Патрэбна, каб кожны актыўна ўключаўся ў справу. Хораша спяваеш, дэкламуеш вершы — ідзі ў агітбрыгаду, умееш добра маляваць — уключайся ў работу рэкалегіі. У атрадзе не павінна быць людзей абыякавых — гэта адно з яго галоўных правілаў.

*З гісторыі «Стэлуцы».* *Па выніках мінулага лета атрад стаў пераможцам сярод СБА Беларусі ў Стаўрапольскай зоне.*

**— Якую работу праводзіць атрад у падрыхтоўчы перыяд?**

**Лідзія Цярэнцьева:** — Навічкі знаёмяцца з гісторыяй атрада, з яго традыцыямі. Ужо выбралі актыў. Праводзім суботнікі, акрамя гэтага, будзем удзельнічаць у конкурсе насценнага друку, які намячаецца правесці сярод усіх СБА ММФ.

**Ірына Парукевіч:** — Не адзін год шэфствуем над Клецкім дзіцячым домам. У хуткім часе плануем паехаць туды з канцэртнай праграмай. Не так даўно заключылі дамоўленасць аб сацыялістычным спаборніцтве з будаўнічым атрадам «Спадчына» Мінскага радыётэхнічнага інстытута.

**— Зразумела, з саўгасам «Цішчанскі» падтрымліваюцца трывалыя сувязі. Гэта ў час працы. А цяпер?**

**Лідзія Цярэнцьева:** — Не будзе перабольшаннем сказаць, што на месцы нашай дыслакацыі атрад ведаюць усе. «Стэлуца» там — бясспрэчны лідэр. Там у нас з'явілася шмат новых знаёмых, сяброў. Праўленне саўгаса кожны год дасылае нам віншавальныя паштоўкі, тэлеграмы, запрашае на будучае лета абавязкова зноў прыязджаць працаваць. Акрамя гэтага, саўгас неаднойчы ўзнагароджваў атрад прэміямі, каштоўнымі падарункамі.

**— Ёсць, напэўна, у «Стэлуцы» і свае ветэраны...**

**Лідзія Цярэнцьева:** — Напрыклад, Алена Францкевіч, Ніна Легеза, Ніна Заіка. Гэтыя дзяўчаты пяць разоў праводзілі сваё лета разам з атрадам. Алена Францкевіч два гады была камісарам атрада. Наступнае лета таксама не будзе выключэннем: Марыя Ляўковец і Вольга Гусева ў гэтым годзе заканчваюць факультэт, але лічаць, што ў атрад паедуць абавязкова.

*З гісторыі «Стэлуцы».* *Мінулым летам атрад правёў чатыры дні ўдарнай працы. Грошы, заробленыя ў гэты час, былі пералічаны ў Фонд міру, у фонд дапамогі пацярпеўшым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, у фонд дапамогі Стаўрапольскаму дзіцячаму дому і ў фонд будаўніцтва горада Гагарына.*

**Ірына Парукевіч:** — Раней аб сапраўдных справах, якія давяраюць камсамольцам, аб іх адносінах да гэтай справы я чытала толькі ў кнігах. А вось усё, як бывае, убачыла тут, у «Стэлуцы». За гэта і я ўдзячна ёй. Зараз чакаю наступнага лета, калі атрад зноў збярэцца ў дарогу.

Наперадзе ў атрада — шмат новых адкрыццяў, цікавых дарог. Няхай жа яны заўсёды будуць шырокія і светлыя, і няхай ніколі не пакідае «Стэлуцу» неспакоенасць і жаданне прыносіць людзям радасць.

**Л. СУРВІЛА,**
студэнтка факультэта журналістыкі.

# НАСУСТРАЧ ЛЮДЗЯМ

*нам пішуць*

Студэнт не студэнт, калі ён не пабываў у будатрадзе. Будатрад! Колькі непаўторных хвілін, колькі незабыўных дзён дорыць ён нам!.. Калі байцы ўспамінаюць сваё будатрадаўскае лета, то адбываецца нешта незвычайнае: у іх вачах пачынаюць гарэць вясёлыя агеньчыкі, гучыць шчыры смех, успамінаюцца розныя здарэнні. Так адбываецца і з байцамі будатрада імя Ф. Шменкеля філалагічнага факультэта.

Калі мы, першакурснікі, пераступілі парог нашага універсітэта, усё для нас было ўпершыню: першая лекцыя, першая сесія, першыя экзамены, а таксама і першы будатрад. Мы вырашылі амаль усёй групай падаць заявы ў адзін будатрад імя Ф. Шменкеля. Пашанцавала нам з камандзірам. Святлана Сіяновіч, студэнтка III курса, вельмі шчыры, душэўны чалавек. Яна мае незвычайную абаяльнасць, якая прыцягвае да яе людзей. (Шкада, што Света зараз на V курсе, але яна нам абяцала быць камандзірам у апошні раз. Мы спадзяёмся на гэта, Света!)

Пасля першага курса мы працавалі ў Стаўбцоўскім раёне. Куды б нас ні паслалі — на ток ці ў поле — усюды стараліся рабіць усё разам. Першы працоўны семестр байцы будатрада вытрымалі на «выдатна». Мы занялі другое месца на факультэце сярод усіх будатрадаў. Падзея радасная.

На наступны год атраду прапанавалі паспрабаваць свае сілы ў новай справе: папрацаваць праваднікамі поезда. Згадзіліся. Першы рэйс... Нягледзячы на тое, што цэлы месяц мы знаёміліся з будучай працай, ён аказаўся нялёгкім. Але без цяжкасцей нідзе не абыходзіцца. Галоўнае ў тым, каб ты змог пераадолець гэтыя цяжкасці. А яны не такія і страшныя, асабліва тады, калі побач надзейны сябар. Такім сябрам аказалася Антаніна Сіняк, з якой мы на працягу двух месяцаў абслугоўвалі пасажыраў па маршрутах «Мінск—Адлер» і «Мінск—Кіславодск». Трэба сказаць, што ўсе байцы атрада справіліся са справай, якую нам даручылі.

На мой погляд, разумець людзей — гэта вялікая навука. Нам даводзілася працаваць з людзьмі розных узростаў, розных характараў. Але з кожным пасажырам мае сябры знаходзілі агульную мову. А гэта нам вельмі спатрэбіцца ў нашай будучай прафесіі — прафесіі настаўніка. І іменна два месяцы працы правадніком паслужылі нам добрай практыкай у пазнанні людзей.

Зараз яшчэ ідуць заняткі. Але думкі раз-пораз залятаюць наперад: якім ён будзе, будатрад-87? Што прынясе ён нам? Чаму навучыць? У нас на факультэце ўжо адбылося фарміраванне будатрадаў. Цяжка нам было падабраць такі састаў, каб не аказалася выпадковых у ім людзей. А заяў было вельмі шмат.

Ну, што ж, нясі нас, час, на сваіх крылах, нясі наперад, насустрач новым справам, насустрач людзям...

**Т. ПАЛЯЛЕЙ,**
студэнтка III курса філалагічнага факультэта.

*успомнім, таварыш!*







*У пачатку жніўня ў байцоў студэнцкіх атрадаў рэспублікі быў незвычайны дзень. Дзень дружбы і музыкі. А работа была адкладзена на цэлыя 24 гадзіны. Гэта быў дзень фестывалю. Ён даў магчымасць юнакам і дзяўчатам ЛСА розных навучальных устаноў пазнаёміцца і пасябраваць, даведацца аб тым, як працуюць, узяць на заметку карысны вопыт. А конкурсы — які фестываль без конкурсаў і атракцыёнаў?! — вылучылі самых вясёлых і знаходлівых. З імгненнямі фестывалю студэнцкіх атрадаў Мінска «Успомнім, таварыш!» вас знаёмяць фотаздымкі С. ПЛЫТКЕВІЧА.*

# Сіла землетрасення вымяраецца па шкале Рыхтэра, грамадская сталасць людзей — па іх учынках

## Восем балаў па шкале Рыхтэра

«13 кастрычніка ў 19.00 гадзін маскоўскага часу на тэрыторыі Таджыкістана адбылося моцнае землетрасенне.

Паводле звестак сейсмічнай станцыі «Душанбе», яго эпіцэнтр знаходзіўся ў 230 кіламетрах на паўночны захад ад сталіцы рэспублікі, за 40 кіламетраў на ўсход ад Ленінабада, дзе сіла падземнага штуршка дасягнула 8 балаў. У гарадах Душанбе, Куляба, Нурэк сіла падземнага штуршка раўнялася 3—4 балам.

Землетрасенне выклікала разбурэнні вытворчых, адміністрацыйных будынкаў, жылля і аб'ектаў сацыяльна-культурнага і бытавога прызначэння ў Кайракуме і Хаджэнцкім раёне. Ёсць чалавечыя ахвяры і параненыя. Пацярпеўшым аказваецца неабходная дапамога, вядуцца аварыйна-выратавальныя работы».

Афіцыйнае паведамленне ТАСС хутка абляцела краіну. Восем балаў па шкале Рыхтэра ўскалыхнулі многіх людзей. Штуршкі землетрасення адгукнуліся ў іх сэрцах. Патрабавалася хуткая дапамога. Далёкі ад Беларусі Таджыкістан наблізіўся. Балы землетрасення ператварыліся ў балы грамадскай актыўнасці студэнтаў гістарычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна.

**Пратакол камсамольскага сходу 1-й групы 3-га курса аддзялення гісторыі ад 24 кастрычніка 1985 года.**

**Парадак дня:**

**Аказанне дапамогі пацярпеўшым раёнам Таджыкістана добраахвотным студэнцкім атрадам бязвыплатнай працы на базе групы.**

**Выступілі: з прапановай аб стварэнні добраахвотнага студэнцкага атрада Л. Цімаховіч, Л. Шманай, Г. Міневіч, А. Пухаў; аб абавязацельствах студэнтаў групы па здачы зімовай сесіі і працы ў атрадзе Л. Барушка, А. Смага, І. Кочнева, Г. Несцярэнка, Н. Шніп, А. Кірычэнка, М. Іванова.**

**Пастанавілі:**

**1. Арганізаваць добраахвотны студэнцкі атрад у складзе 20 чалавек для аказання дапамогі.**

**2. Прыняць наступныя абавязацельствы па здачы зімовай сесіі: самастойна вывучыць вучэбны матэрыял, які будзе прапушчаны ў перыяд работы ў Таджыкістане; прадставіць экзаменатарам канспекты першакрыніц і іншай неабходнай для поўнага засваення матэрыялу літаратуры; здаць сесію на «добра» і «выдатна».**

**3. Па рабоце добраахвотнага студэнцкага атрада: ударна працаваць, як належыць студэнцкаму будаўнічаму атраду, пастаянна выконваць і перавыконваць устаноўлены аб'ём работ, дастойна прадстаўляць нашым атрадам Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна.**

**Старшыня Г. Міневіч, сакратар І. Кочнева.**

А пад пратаколам — 20 подпісаў. Яны сведчаць аб розных характарах іх уладальнікаў: спакойных і няўрымслівых, імклівых і павольных. Але ўсіх гэтых дзяўчат і хлопцаў аб'ядноўвала адно — імкненне дапамагчы людзям. Незнаёмым людзям. Іх уразілі не столькі разбурэнні, колькі радкі інфармацыі — трывожныя, гаротныя — ёсць чалавечыя ахвяры. Студэнты-гісторыкі імкнуліся аказаць дапамогу. Адчувалі сябе неабходнымі там.

Дэканат выезд у Таджыкістан дазволіў, прыняў умовы студэнтаў наконт здачы зімовай сесіі. Ланцужок рэакцыі пацягнуўся далей — ад камсамольскай групы ў камітэт камсамола факультэта, потым — у камітэт камсамола універсітэта, пасля — у абласны штаб СБА, і — у рэспубліканскі. Нарэшце, тэлефанавалі ў ЦК ВЛКСМ. Галіна Несцярэнка сама назірала, каб ланцужок не абарваўся.

З ЦК ВЛКСМ па тэлефоне студэнтам ветліва і вельмі далікатна растлумачылі:

— У даны момант у такім атрадзе няма неабходнасці. Няма мэтазгоднасці яго адпраўкі.

Пазней студэнты даведаліся, што на зімовых канікулах у Таджыкістане працаваў студэнцкі атрад з Казахстана. Быў сфарміраваны Усесаюзны атрад «Дружба», у які ўвайшлі спецыялісты.

— Мабыць, гэта і правільна, — гаворыць сакратар камітэта камсамола гістфака Сяргей Літвінчык, — бульдазерысты, трактарысты, электрыкі на той перыяд былі больш патрэбныя, чым студэнты. Мы знаходзімся далёка...

Так, Беларусь далёка ад Ленінабада ў сэнсе адлегласці. Але студэнты ўсё ж чакалі лета, каб выехаць атрадам у Таджыкістан, не ведаючы, ці дазволяць выезд на гэты раз.

**З газеты «Ленинабадская правда»: «...Заканчвалася праграма «Час». Озераў толькі пачаў расказваць аб спартыўных падзеях.**

**— Мне падалося, што выстралілі з гарматы, — успамінае жыхар пасёлка Сырдар'інскі Анвар Атаеў. — Гул, грукат, затрашчалі сцены, пасыпалася пабелка, патухла святло. Схапіў дзяцей, выбег з імі на вуліцу. Калі першае хваляванне ўляглося, зразумеў, што трэба дзейнічаць. Пайшоў па пасёлку высвятляць, ці не патрэбна дапамога.**

**У гэты час у Сырдар'інскі паступіла паведамленне: моцна пацярпелі цэхі дывановага аб'яднання, патрэбны выратавальнікі...»**

Дазвол на стварэнне атрада прыйшоў нечакана. Высветлілася, з такой жа ініцыятывай — накіраваць СБА ў раёны, пацярпеўшыя ад землетрасення — звярнуліся ў ЦК ВЛКСМ студэнты Масквы і Казахстана.

Сяргей Літвінчык як камандзір атрада бязвыплатнай працы ездзіў заключаць дагавор у Ленінабад. Адтуль ён прывёз шмат уражанняў. А яшчэ — газеты, выразкі з якіх потым трапілі ў насценную газету СБА.

**З газеты «Ленинабадская правда»: «Экстрэмальныя сітуацыі выяўляюць чалавека. Кайракум, дакладней, яго людзі, якія апынуліся ў эпіцэнтры землетрасення, вытрымалі выпрабаванне на трываласць. На досвітку прыйшла да галоўнага ўрача гарадской бальніцы брыгадзір хлебакамбіната Ніна Аляксандрава. Прыйшла не толькі ад сябе асабіста, ад групы кайракумцаў, прапанавала даць кроў для параненых...»**

— Калі б не было землетрасення, то ў нас, відаць, не склаўся б менавіта такі будатрад. Мы ехалі ў Таджыкістан з канкрэтнай, дакладнай мэтай — сваёй працай прынесці карысць людзям, а сродкамі ад яе дапамагчы дзецям, бацькі якіх загінулі ў час землетрасення, — удакладняе Сяргей Літвінчык.

Атрад «Белая Русь» у складзе 30 чалавек у ліпені адбыў у Ленінабад на дапамогу. Алена Аборына ехала трэці раз (два папярэднія была камісарам у мужчынскіх СБА). А Мікалай Ільюшонак толькі што змяніў ваенную форму на будатрадаўскую.

Першае адчуванне — трапілі ў пекла. Гарачыня — звыш 40 градусаў у цяню. Працавалі на будаўніцтве завода ў дзве змены — выконвалі бетонныя работы, залівалі керамзіт. У вольны час не маглі адмовіцца ад удзелу ў Паўночна-Таджыкскай археалагічнай экспедыцыі — спрацаваў азарт гісторыкаў. Экспедыцыя вяла раскопкі цытадэлі Аляксандра Македонскага, грунт — скальныя пароды. Студэнты знаходзілі чарапкі ад збаноў. Па іх можна было даведацца, яе зберагалі збожжа ў даўнішнія часы. Нічога новага яны ў цытадэлі не адкрылі. Не пашанцавала!

Але новае адкрывалася тут, на паверхні. Новае стваралі яны самі, іх рукі, іх сэрцы. Як вытрымлівалі такія напружаныя працоўныя не дні, а суткі? Гэта, відаць, застанецца загадкай для новых пакаленняў археолагаў.

Нават калі змена заканчвалася, але раптам прывозілі машыну з бетонам ці бітумам, — яны заставаліся разгружаць. Чаму? Не дзеля ж грошай ішлі яны на аўрал. Так было неабходна, каб хутчэй ліквідаваць вынікі землетрасення. А раніцай, разам з сонцам, падымаліся і ішлі на раскопкі цытадэлі. І так кожныя суткі. І хлопцы, і дзяўчаты.

Потым да байцоў звярнуўся Ленінабадскі гарком камсамола — трэба было дапамагчы ў рэканструкцыі стадыёна «Спартак». І яны зноў працавалі. Прыбівалі шчыты, прызначаныя для прапаганды розных відаў спорту, якія адмовіліся вешаць рабочыя, фарбавалі лаўкі, падсыпалі футбольнае поле...

У чым феномен такой працаздольнасці? Гавораць, што фізічная сіла чалавека знаходзіцца ў непасрэднай залежнасці ад сілы яго духу. Сілы душы. Пачуццё грамадскай адказнасці асобы стала галоўным крытэрыем працы студэнтаў атрада «Белая Русь». Атрада бязвыплатнай працы.

**З газеты «Ленинабадская правда»: «Цяжэй за ўсё прыйшлося дываншчыкам. Аб'яднанне працуе па бесперапыннаму графіку. Ішла другая змена. Большасць людзей не пакінула вытворчасці. Калі асеў пыл, пры святле факелаў пачаліся выратавальныя работы. Памочнікі майстроў, ткачыхі, прадзільшчыцы сталі санітарамі, сапёрамі. Да раніцы расчышчалі завалы...»**

Потым, на абласным фестывалі студэнцкіх атрадаў, байцы «Белай Русі» ўбачаць кадры фільма пра Кайракумскі дывановы камбінат, аб якім раней пісала газета. Завалы, разбураныя пліты, а пад імі — людзі...

На дапамогу таджыкам у Ленінабад прыехала 20 СКА. З усіх саюзных рэспублік. Сярод іх былі два атрады бязвыплатнай працы — Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Ленінабадскага медвучылішча. Будаўнічы камуністычны атрад толькі адзін — «Белая Русь».

Кожны рабочы дзень Сяргею Літвінчыку прыходзілася тлумачыць у бухгалтэрыі, што яны зарobленыя грошы не возьмуць сабе. Яму не верылі. Маўляў, ведаем, дагэтуль усе людзі атрымлівалі грошы, а вы быццам бы адмовіцеся, Такога ў практыцы бухгалтэрыі не было. Крыўдна, што не паверылі не толькі там. У Ленінабадскім гаркоме камсамола ўпэўніліся, відаць, таксама не да канца. Таму што на шматлікія вытворчыя просьбы з боку атрада часцей за ўсё ніяк не рэагавалі.

Сапсаваліся на тэрыторыі завода балоны ў аўтаматах з газвадой, а спякота — страшэнная. Па горадзе такіх аўтаматаў сотні стаяць, але змяніць зламаныя за ўвесь час работы атрада не ўдалося. У гаркоме толькі абяцалі і ўдакладнялі, быццам справа настолькі складаная, што патрабуе ўмяшання авіяцыі. Нічога не атрымалася і з бочкай квасу, якую студэнты абяцалі купіць адразу. Куды ні звярталіся — кругом ім адмаўлялі.

Байцы СБА ўлічвалі цяжкае становішча Ленінабадскай вобласці і не патрабавалі нечага немагчымага. Але былі і тыя, якія падтрымлівалі і верылі студэнтам заўсёды — брыгадзір ПМК-33 Файзуло Умараў, кавалер ордэнаў Леніна, Працоўнай Славы, «Знак Пашаны» і яго рабочыя. Умараў кіраваў студэнтамі, тлумачыў азы будаўнічай навукі, дапамагаў. Да яго можна было звярнуцца заўсёды — брыгадзір заўжды на будаўнічай пляцоўцы.

**З газеты «Ленинабадская правда»: «Мы, байцы Усесаюзнага студэнцкага атрада, працавалі на аднаўленні аб'ектаў, якія пацярпелі ў час землетрасення, — гаворыць камісар атрада «Белая Русь» Аляксандр Пухаў. — Гэта была праца дзеля мірнага жыцця, дзеля шчасця савецкіх людзей, каб шчасліва раслі дзеці...»**

Дзеці бачаць навакольны свет, у адрозненне ад некаторых дарослых, каляровым, радасным, прыгожым. Прырода Таджыкістана пастаралася, каб ім заўсёды спрыяла вясёлка. Горы вакол Ісфары каляровыя: чырвоныя, блакітныя, жоўтыя, залёныя, нібы вясёлка з неба шуганула на зямлю. Каб дзеці Ісфарынскага дзіцячага дома хаця б на некаторы час змаглі забыць сваё гора — страту бацькоў. Яны з кветкамі, у чырваных гальштуках сустракалі дарослых — прадстаўнікоў атрада «Белая Русь». Вось ужо расстаўлены ў пакоях халадзільнік, каляровы тэлевізар, піяніна, кудысьці пакладзены цэлы скрутак фіранкавай тканіны, і дзеці даверліва расселіся на каленях Сашы Пухава, абляпілі Алену Аборыну і Сяргея Літвінчыка, і ў кожнага на грудзях засвяціўся новы значок, як памяць пра далёкую Беларусь.

Дзіцячая памяць учэпістая, яна назаўсёды адбіла і шчырыя ўсмешкі будатрадаўцаў, і іх пяшчотныя, ласкавыя рукі, нават калі гэтыя малыя стануць дарослымі і сур'ёзнымі людзьмі...

Апошні дзень працы ў атрадзе прынёс вестку аб першынстве ў сацыялістычным спаборніцтве сярод СБА зоны. Асвоена 60 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Тысяча рублёў пералічана ў Фонд міру. 2 тысячы — Ісфарынскаму дзіцячаму дому. І нічога — сабе. Тыя, хто яшчэ сумняваўся, не скончылі здзіўляцца. Тыя, хто верыў з самага пачатку, радаваліся і з удзячнасцю праводзілі гасцей з Беларусі дадому...

— З асобнымі людзьмі, якія могуць аддаць усю сваю энергію людзям, да атрада я сустракаўся. З цэлым маналітным калектывам — ніколі, — гаворыць Сяргей Літвінчык. — Гэта быў атрад аднадумцаў. Ён сваё прызначэнне выканаў.

Гэта быў першы атрад бязвыплатнай працы, які выязджаў за межы рэспублікі. Гэта быў камуністычны атрад моладзі, створаны не дзеля «галачкі» ў справаздачы. Ініцыятыва камсамольскай групы гістарычнага факультэта вылілася ў канкрэтную сацыяльна важную справу, якую так патрабуе час.

Сіла землетрасення вымяраецца па шкале Рыхтэра, грамадская сталасць людзей — па іх учынках. У атрадзе хлопцы і дзяўчаты да канца ўсвядомілі ўсю невычарпальнасць чалавечай душы, здатнасць яе на сапраўдныя ўчынкі. Ці былі яны рамантыкамі там, у Ленінабадзе? Вядома! Але іх рамантыка моцна перапляталася з пачуццём абавязку. Яна матэрыялізавалася ў сцены завода, рэканструяваны стадыён, раскопкі цытадэлі Македонскага. Іх рамантыка азарылася шчодрасцю, духоўным багаццем сэрцаў. Часцінка якіх назаўсёды засталася ў Таджыкістане.

А. ЛУКАШЭВІЧ.

**У АТРАДЗЕ УСЕ СКЛАЛАСЯ ВЫДАТНА. ВОСЬ ТОЛЬКІ РЭАКЦЫЯ НА КАМСАМОЛЬСКУЮ ІНІЦЫЯТЫВУ ЗНІЗУ ВЫШЭЙСТАЯЧЫХ РАБОТНІКАЎ КРЫХУ НЕЗРАЗУМЕЛАЯ. ВЯРНУЎСЯ СБА Ў БЕЛАРУСЬ І НІБЫ АПЫНУЎСЯ Ў БЕСПАВЕТРАНАЙ ПРАСТОРЫ. АМАЛЬ НІХТО ПРА ЯГО ДАКЛАДНА НЕ ВЕДАЕ. НАБЫТЫ ВОПЫТ НЕ АБАГУЛЬНЕНЫ. НЯЎЖО ТАК І БУДУЦЬ «ПРАХОДЗІЦЬ» ХЛОПЦЫ І ДЗЯЎЧАТЫ ТОЛЬКІ Ў СПРАВАЗДАЧНЫМ СПІСЕ БУДАТРАДАЎ, СЯРОД ЛІЧБАЎ?**

# У нас у гасцях газета «За навуку»

*ПРАЦЯГВАЕЦЦА знаёмства з насценным друкам факультэтаў і падраздзяленняў універсітэта. Сёння ў нас у гасцях насценгазета «За навуку» (рэдактар У. Аджаеў, старшы навуковы супрацоўнік кафедры фізікі паўправаднікоў). Газета фізічнага факультэта неаднаразова станавілася прызёрам у конкурсе насценгазет. Яна мае прыгожы знешні выгляд. Рэдкалегія, у якую ўваходзяць студэнты і супрацоўнікі факультэта, імкнецца асвятляць усе бакі жыцця фізікаў, іх поспехі і праблемы. Газету на факультэце любяць і з задавальненнем знаёмяцца з яе матэрыяламі.*

*Сустрэчу з газетай фізфака «За навуку» на старонках «Беларускага універсітэта» арганізавала член прэс-цэнтра камітэта камсамола універсітэта студэнтка IV курса факультэта журналістыкі Наташа Пахомава.*

*нашы інтэрв'ю*

## КВЗ? КВЗ!

Вось ён ідзе па ўсяму універсітэту. КВЗ збірае тых, хто сябруе са смехам, дасціпным жартам. Адгукнуліся на фізфаку на заклік студклуба і камітэта камсамола. І цяпер вясёлыя і знаходлівыя фізікі чакаюць фінalу. А пакуль. некалькі меркаванняў членаў каманды для нашай газеты.

Мікалай Яраш, супрацоўнік кафедры ядзернай фізікі, капітан каманды:

— Я КВЗ баюся. Таму што пасля конкурсу капітанаў мне пачало здавацца, што ў кагосьці з нас, у мяне альбо ў журы, адсутнічае пачуццё гумару.

Ігар Федарэнчык, студэнт V курса:

— Я так нічога і не зразумеў. Магу сказаць толькі, што пасля мінулага КВЗ я цвёрда вырашыў паступаць у музычную школу.

Андрэй Яноўскі, супрацоўнік кафедры фізікі паўправаднікоў:

— Для каго ўсё ж робіцца КВЗ: для гледачоў альбо для журы? Раней я быў цвёрда ўпэўнены, што для гледачоў — у першую чаргу. Пасля апошняга КВЗ упэўненасць мая пахіснулася.

І ўсё ж давайце забудземся пра суддзяў. Нашы галоўныя суддзі — вы, нашы гледачы. І мы будзем гуляць так, каб гэта, перш за ўсё, падабалася вам.

*прашу слова*

## ЯК ЛЕПШ АБМЕРКАВАЦЬ?

ДА ПЫТАННЯ АБ ЗМЕНАХ І ДАПАЎНЕННЯХ ДА ПРАЕКТА СТАТУТА ВЛКСМ, Я ДУМАЮ, ТРЭБА ПАДЫСЦІ ТАК. ПАРАЎНАЦЬ ПАЛАЖЭННІ СТАТУТА З РЭАЛЬНА ІСНУЮЧЫМ ЖЫЦЦЁМ. І ТАМ, ДЗЕ МЫ ЗНОЙДЗЕМ АДРОЗНЕННІ, УЖО ДУМАЦЬ, ШТО КАРЫСНА І ЛЕПШ: ЗМЯНІЦЬ ПАЛАЖЭННІ СТАТУТА Ў БОК САПРАЎДЫ ІСНУЮЧАГА АБО ПЕРАБУДОЎВАЦЬ НАША ЖЫЦЦЁ Ў СУАДНОСІНАХ СА СТАТУТАМ ВЛКСМ.

Па-першае, «аб'ядноўваючая передавую частку савецкай моладзі». Вы не будзеце пярэчыць супраць таго, што ў нашай камсамоліі ў наяўнасці не толькі передавая моладзь. Шмат цяпер гавораць пра тое, што мы ўсіх прымаем у камсамол...

Я лічу, што цяперашні працэнт камсамольцаў сярод моладзі больш або менш здавальняючы, таму што асноўная задача камсамола — выхоўваць, а як выхаваць «некамсамольца», калі ён сваім «нячленствам» не толькі прыкрываецца, але іншы раз нават і ганарыцца. Таму ў Статуце можна запісаць так: «грамадска-палітычная арганізацыя савецкай моладзі». Слова «перадавая» мае важнае палітычнае значэнне. Яго можна сфармуляваць так: «арганізацыя перадавой савецкай моладзі».

Але словы словамі, а праблемы застануцца. І вырашаць іх трэба не скарачэннем працэнта камсамольцаў, а павышэннем аўтарытэту самой камсамольскай арганізацыі. Дарэчы, не перад несаюзнай моладдзю, а перад самімі камсамольцамі. Як?

Калі разабрацца, дык у камсамола правоў ніякіх, акрамя некаторых арганізацыйных, няма. Узнагародзіць камсамольская арганізацыя нікога не можа: няма чым. Што тут можна зрабіць? Напрыклад, камсамольскім арганізацыям трэба мець некаторы грашовы фонд, каб яны маглі праводзіць свае мерапрыемствы і ні ад каго не залежаць. Гэты фонд можна папаўняць за кошт суботнікаў.

Далей, якія яшчэ можна прапанаваць метады для павышэння аўтарытэту камсамола? Трэба абрад прыёму ў камсамол зрабіць больш індывідуальным. Мы павінны бачыць, каго прымаем у свае рады. Ад гэтага папаўнення ў значнай ступені залежыць працаздольнасць і будучае нашай арганізацыі.

І. АКУШЭВІЧ,
намеснік сакратара камітэта камсамола фізфака па ідэалогіі.

*слова выпускніку*

## «Мне — зайздросцяць»

Штогод шмат замежных студэнтаў заканчваюць фізічны факультэт. Прыемна, што яны імкнуцца падтрымліваць сувязі з факультэтам: дасылаюць віншаванні са святамі, лісты, у якіх расказваюць пра сваё жыццё, дасягнутыя поспехі, дзеляцца сваімі думкамі. Мы вырашылі надрукаваць частку з ліста, які даслаў Лы Хонг Т'ау:

*...«СПРАВЫ ідуць добра. Мае сябры ніколі не чакалі, што я — фізік, магу ўпэўнена працаваць у галіне электронікі і мікра-ЭВМ. Яны не думалі, што на нашай кафедры нараджаюцца «універсальныя» спецыялісты. Вашы звесткі па інтэгральных схемах і некаторыя кнігі вельмі дапамагаюць мне ў рабоце. Усе зайздросцяць, што ў мяне ёсць добрыя і чулыя настаўнікі.*

*...У нашай краіне з'яўляюцца першыя мікра-ЭВМ. І гэта не дае мне спакою, трэба кожны дзень знаёміцца з навінкамі.*

*...Толькі цяпер я зразумеў, што жыць і працаваць у вашай краіне — гэта проста мара. Вельмі хочацца атрымаць ад вас, паважаныя мае выкладчыкі, некаторыя кнігі, артыкулы, парады па пытаннях мікра-ЭВМ.*

*...Што датычыць мяне, праз новыя ўмовы працы і жыцця я ствараю сабе такі план — увесь час толькі для работы: чытанне новай спецыяльнай літаратуры, сур'ёзнае вывучэнне англійскай мовы.*

*Аднойчы ўбачыў па тэлебачанню народны танец Беларусі. Гэта мяне вельмі ўсхвалявала. На жаль, футбольных праграм паказваюць мала. Як даўно я не бачыў гульні мінскага «Дынама», зборнай СССР.*

*Перадавайце прывітанне ўсім выкладчыкам нашай кафедры. Хачу пажадаць усім здароўя, шчасця і поспехаў.*

*ЛЫ ХОНГ Т'АУ,*
*г. Хо Шы Мін.*

*савет маладых вучоных і спецыялістаў*

## Ці нельга без праблем?

АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА СМВ — СТВАРЫЦЬ УМОВЫ, НЕАБХОДНЫЯ ДЛЯ НАЙБОЛЬШ ЭФЕКТЫЎНАЙ РАБОТЫ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ І СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ФАКУЛЬТЭТА. А ФОРМЫ ІХ ВЫРАШЭННЯ — РАЗНАСТАЙНЫЯ. ГЭТА ЗБОР ІНФАРМАЦЫІ АБ КАНФЕРЭНЦЫЯХ, ПРАВЯДЗЕННЕ АГЛЯДАЎ-КОНКУРСАЎ НА ЛЕПШУЮ НАВУКОВУЮ ПРАЦУ, УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА.

НА ЖАЛЬ, ёсць у нас і праблемы. У 1984 годзе адбылася VIII Рэспубліканская канферэнцыя маладых вучоных Беларусі, а чарговая павінна была прайсці ў 1986 годзе, але яе не было. Пытанне аб канферэнцыі маладых вучоных Беларусі застаецца адкрытым.

Здаецца, што заслугоўвае ўвагі вопыт правядзення падобных канферэнцый у Літоўскай ССР, дзе створаны не толькі цудоўныя ўмовы для навуковай працы, але і шырокіх зносін, адпачынку, занятказ спортам. Для правядзення канферэнцыі маладых вучоных неабходны намаганні БДУ і АН БССР, падтрымка Міністэрства ВНУ БССР.

У 1986 годзе маладымі вучонымі факультэта абаронена 12 дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата навук, у той час калі звычайна абараняецца ў год іх 4—5. У 1987 годзе гэты паказчык не павінен пагоршыцца, таму што да гэтага часу падрыхтаваны шэраг дысертацый маладымі супрацоўнікамі факультэта. Пажадаем ім паспяховай абароны.

Прыемна адзначыць, што работы маладых вучоных нашага факультэта заслугоўваюць прызнання і на ўсесаюзнай арэне. Нядаўна ў Белдзяржуніверсітэт прыйшоў ліст аргкамітэта II Усесаюзнай канферэнцыі маладых вучоных «Тэарэтычная і прыкладная оптыка», у якім адзначаны ў якасці лепшых даклады Слабадзенюка і Ганчаронка.

Хочацца пажадаць маладым вучоным факультэта плённай працы, цікавых навуковых і практычна важных вынікаў, актыўнага ўдзелу грамадскай рабоце. А прыклад ёсць з каго браць!

Р. ПІЦЭВІЧ,
старшыня СМВ і С фізічнага факультэта.



*свет тваіх захапленняў*

## Дзверы адчыняе клуб

Які? Клуб аматараў спартыўна-лагічных гульняў! Створаны ён пры пярвічнай арганізацыі таварыства барацьбы за цвярозасць. Узначальвае яго член праўлення факультэцкай арганізацыі таварыства дацэнт І. Д. Феранчук.

ШТО Ж УЯЎЛЯЕ сабой гэты клуб? Кожны жадаючы можа паспрабаваць тут свае сілы як у традыцыйных відах інтэлектуальных гульняў — шашках і шахматах, так і ў новых — шашках «рэндзю» і спартыўным брыджы. Тэзіс пра «маламядомасць» шашак «рэндзю» вельмі спрэчны. Хто з нас не гуляў у «крыжыкі-нулікі» на ўвесь ліст? Гэта гульня амаль нічым не адрозніваецца ад шашак «рэндзю», толькі японская назва гучыць больш рамантычна і загадкава.

Вось што датычыцца спартыўнага брыджа, тут складаней. Калі на арганізацыйным сходзе пайшла гутарка пра яго, адзін з супрацоўнікаў адразу ж прапанаваў пагуляць у «спартыўнае ачко» або «спартыўны прэферанс». З задавальненнем адзначу пачуццё гумару фізікаў і імкненне разважаць нават аб тым, аб чым не маеш ніякага ўяўлення. Таму некалькі слоў пра спартыўны брыдж.

З папулярнымі картачнымі гульнямі яго родніць толькі тое, што ў брыджы таксама гуляюць картамі, але на гэтым падабенства заканчваецца. Адсутнічае нездаровы азарт, шанцаванне і іншыя элементы, дзякуючы якім карты набылі не зусім прыстойную рэпутацыю. Тут хочацца падкрэсліць, што правільней будзе сказаць не «карты», а «карцёжнікі». Карты самі па сабе не павінны ў тым, што некаму прыйдзе ў галаву прыплюсаваць да заробку непрацоўны даход. Справа тут хутчэй у выхаванні, таму што калі б не было карт, такія людзі пачалі б гуляць «на інтарэс», скажам, у шахматы, што, дарэчы, ужо мае месца.

Лепшы доказ здаровага характару спартыўнага брыджа — стварэнне сусветнай федэрацыі спартыўнага брыджа ў 1959 годзе, якая налічвае 59 краін. Праводзяцца чэмпіянаты свету і Еўропы, алімпіяды, разыгрываецца Кубак краін сацыялізму.

У СССР развіццё спартыўнага брыджа толькі пачынаецца, але ўжо цяпер гуляе каля 100 тысяч чалавек. Афіцыйна зарэгістраваны секцыі ў Тарту і Чарапаўцы. Ёсць першыя поспехі і на міжнароднай арэне.

Адбыліся першыя спаборніцтвы і ў нашым клубе: парны турнір і каманднае першынство на факультэце. Вызначыліся дастаткова моцныя ігракі — Феранчук, Якубеня, Градоўскі.

Спартыўны брыдж набірае сілу, наш клуб толькі ў пачатку свайго станаўлення. Калі нехта зацікавіўся ім — чакаем. Дзверы адчынены для ўсіх. Нават калі гэтыя дзверы пакуль толькі запланаваныя.

І. ПАЛАНЕЙЧЫК.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

12 сакавіка 1987 года.

Зак. 1573.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЕЎ.